В.А.Касап, Р.А.Ровіна

## Бібліяграфічныя дапаможнікі па сельскай гаспадарцы

За пяцігадовы перыяд колькасць бібліяграфічных паказальнікаў па сельскай гаспадарцы, выдадзеных у рэспубліцы на паперы, рэзка скарацілася. Калі раней штогод складалася 15-20 бібліяграфічных паказальнікаў, то за 1991-1995 гады іх складзена каля 30. Назіраецца паслядоўнае іх скарачэнне і па гадах. Як і раней, найбольшую колькасць складаюць рэтраспектыўныя і рэкамендацыйныя паказальнікі. Трэба адзначыць і новую тэндэнцыю - гэта павышэнне актыўнасці бібліятэк ВНУ, НДІ у падрыхтоўцы бібліяграфічных паказальнікаў. За 5 год было падрыхтавана 14, амаль 50 % паказальнікаў. У асноўным выдадзеныя паказальнікі - гэта самастойныя паліграфічна афармленыя адзінкі. І толькі адзін з іх (акрамя рэкамендацыйных у "Новых кнігах Беларусі"), які ўяўляе сабой агляд навуковых прац І.С.Лупіновіча (902(1991 г.)), надрукаваны ў зборніку артыкулаў.

Бягучыя бібліяграфічныя паказальнікі былі прадстаўлены анатаваным тэматычным паказальнікам літаратуры па аграметэаралогіі (891(1991 г.), 676(1992 г.), 1220(1993 г.)), які выходзіў з 1978 года па паўгоддзям; паказальнікамі новых дакументаў, якія паступілі ў ВНИИТИМЖ (687(1992 г.), 1222(1993 г.), а таксама тэматычнай падборкай БФ ВНИИТЭИагропром.

Сярод іх трэба адзначыць высокую якасць паказальніка па аграметэаралогіі, матэрыял у якім размяшчаецца па раздзелах. На кожны дакумент складзена даведачная анатацыя, зборнікі прац і матэрыялы канферэнцый аналітычна распісаны. У канцы паказальніка ёсць спіс скарачэнняў.

Два паказальнікі прац супрацоўнікаў устаноў працягваюць тэндэнцыю адлюстравання навуковай думкі вучоных і спецыялістаў за пэўны перыяд. Зараз значнасць такіх паказальнікаў ўзрастае ў сувязі з інфармацыйным вакуумам у рэспубліцы. Напрыклад, "Указатель печатных работ сотрудников БелНИИ животноводства (1985-1990 гг.)" (728(1992 г.)) працягвае ўжо існуючую традыцыю адлюстравання ўсёй інтэлектуальнай прадукцыі вучоных і спецыялістаў інстытута. Тут знайшлі адлюстраванне кнігі, брашуры інфармацыйныя матэрыялы, аўтарэфераты дысертацый, аўтарскія пасведчанні, артыкулы з часопісаў і зборнікаў, газет, плакаты, буклеты, справаздачы, бібліяграфічныя паказальнікі. Трэба адзначыць паўнату адлюстравання матэрыялаў. Як і ў папярэднім паказальніку, тут прыводзяцца наступныя даведачныя элементы: імянны паказальнік, прыклады скарачэнняў слоў, прыклады бібліяграфічнага апісання розных відаў дакументаў. Хаця як і ў папярэднім выданні, бібліяграфічнае апісанне патэнтных дакументаў не адпавядае ДАСТ. У паказальніку друкаваных прац супрацоўнікаў Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута 670(1992 г.)) адлюстраваны і дысертацыі, што не адпавядае назве паказальніка. У дапаўненне да імяннога паказальніка аўтараў складзены яшчэ і прадметны паказальнік, што звязана са шматбаковай дзейнасцю розных кафедраў ВНУ.

Як заўсёды, значная частка рэкамендацыйных паказальнікаў была падрыхтавана ў "Новых кнігах Беларусі" (6(1991 г.), 7(1992 г.), 6(1993 г.) 4(1994 г.)). Калі ў 1991 годзе іх тэматыка была звязана з рашэннем значных для галіны праблем, (напрыклад, "Мелиорация и экология земель Белоруссии"(984(1991 г.)), у 1992 годзе - з пераходам галіны да рынкавых адносін, то ў 1993 годзе ўсе яны былі складзены ў дапамогу дачнікам. Трэба адзначыць і складанне вялікага па аб'ёму рэкамендацыйнага паказальніка ў дапамогу



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фермерам, арандатарам (671(1992 г.)), які падрыхтавала Мінская абласная бібліятэка.

У 1991 годзе БСГБ працягвала супрацоўніцтва з рэспубліканскім таварыствам "Кніга", разам з якім падрыхтавала 2 лістоўкі "Книгу рекомендует специалист". Іх метадычныя асаблівасці не змяніліся, аб чым ужо гаварылася*

Асобна трэба спыніцца на біябібліяграфічных паказальніках. У іх падрыхтоўцы ўдзельнічалі бібліятэка Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута (ГСГІ), Беларускага навукова-даследчага інстытута меліярацыі і лугаводства (БелНДІМЛ), Беларускага навукова-даследчага інстытута бульбаводства (БелНДІБ), Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі (БелСГА).

І хоць яны аднесены да аднаго тыпу, методыка іх падрыхтоўкі, афармленне, якасць друкавання - розныя. Ужо ў назве паказальнікаў ёсць адрозненні. Прытрымліваецца ДАСТ у вызначэнні гэтага віда бібліяграфічнай прадукцыі бібліятэка ГСГІ. Усе матэрыялы аб'яднаны ў серыю "Матэрыялы да біябібліяграфіі вучоных інстытута" (1223, 1248, 1278, 1301-02(1993 г.)). Іншыя складальнікі называюць такі паказальнік "бібліяграфія" (БелСГА 2 разы), БелНДІМЛ (1 раз), што супярэчыць патрабаванням ДАСТ 70-84 "Бібліяграфічная дзейнасць". Знешняе афармленне таксама больш прывабнае ў паказальнікаў ГСГІ.

Размяшчэнне матэрыяла часцей за ўсё традыцыйнае - звесткі аб жыцці і дзейнасці, спіс усіх прац па гадах і паказальнікі. Аднак у некаторых выданнях асобна выдзяляюцца раздзелы па відах публікацый (напр.: манаграфіі, артыкулы, аўтарскія пасведчанні і патэнты і г.д.). Не заўсёды ёсць дапаможныя паказальнікі : алфавітны і сааўтараў. Ёсць прыклады размяшчэння матэрыяла па гадах, але без унутранай нумарацыі, ці ўвогуле адзіным спісам без выдзялення гадоў. Усё гэта можа сведчыць аб адным: адсутнасці ў рэспубліцы метадычных указанняў па падрыхтоўцы біябібліяграфічных паказальнікаў. І з тым, што з выданнем ЦНСГБ Расіі многія не знаёмы.*

З 1993 года вядучая сельскагаспадарчая бібліятэка рэспублікі БСГБ не рыхтуе паказальнікі літаратуры на паперы. Аднак з дапамогай розных баз дадзеных (якіх ужо больш 30) чытачы маюць магчымасць атрымліваць інфармацыю ў машыначытальным варыянце.

І.У.Дрыга

## Бібліяграфічныя дапаможнікі па фізічнай культуры і спорту, мастацкай літаратуры і літаратуразнаўству, культуры, мастацтву

Цэнтрам стварэння крыніц бібліяграфічнай інфармацыі па фізічнай культуры і спорту з'яўляецца Рэспубліканская навукова-метадычная бібліятэка па фізічнай культуры. У разглядаемы перыяд яна працягвала выданне штоквартальнага бібліяграфічнага паказальніка "Новая литература по физической культуре и спорту, поступившая в библиотеку" (1136(1991

---

* Касап В.А. Бібліяграфічныя паказальнікі па сельскай гаспадарцы // Паказальнік бібліяграфічных дапаможнікаў БССР, 1989. - Мн., 1990. - С. 17-20.

*Технология составления биобиблиографических пособий: Метод. рекомендации / ЦНСХБ. - М., 1988. - 20 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ